# РОЛЯ ГІСТАРЫЗМАЎ У СТВАРЭННІ КАЛАРЫТУ ЭПОХІ Ў МАСТАЦКІХ ТВОРАХ (НА ПРЫКЛАДЗЕ РАМАНА У. КАРАТКЕВІЧА «ХРЫСТОС ПРЫЗЯМЛІЎСЯ Ў ГАРОДНІ»)

**А. А. Гуліцкі**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*l_gulitskiy@mail.ru;*
*навук. кір. – П. П. Жаўняровіч, канд. філал. навук, дац.*

Разглядаюцца асаблівасці ўжывання гістарызмаў у рамане Уладзіміра Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». Адзначаецца, што без іх не можа абысціся літаратура на гістарычную тэматыку, бо пры дапамозе гэтых лексічных адзінак аўтар стварае праўдзівы каларыт эпохі, які актыўна ўплывае на ўспрыманне твора чытачом. Выкарыстанне гістарызмаў розных тэматычных груп дазваляе ахарактарызаваць побыт насельніцтва, яго адзенне, стравы, вайсковы рыштунак і інш. Даследаванне гістарызмаў паглыбляе разуменне лексічнага багацця беларускай мовы.

***Ключавыя словы:*** устарэлая лексіка; гістарызмы; каларыт эпохі; У. Караткевіч; раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні».

Лексіка беларускай мовы ў працэсе гістарычнага развіцця безупынна мяняецца. Яе слоўнікавы склад увесь час папаўняецца новымі словамі, неабходнасць у з’яўленні якіх паўстае ў сувязі з дынамічным развіццём навукі, тэхнікі, культуры, грамадства ў цэлым. Гэтымі ж з’явамі тлумачыцца і адваротны працэс – знікненне слоў. Змяненне побыту і звычаяў паступова надае некаторым словам адценне ўстарэласці, што ў выніку прыводзіць да замены іх іншымі (архаізмы) ці ўвогуле да знікнення (гістарызмы).

Такія словы, аднак, знаходзяць новыя сферы ўжытку. Адным з арганічных месцаў іх знаходжання з’яўляюцца творы гістарычнай літаратуры і мастацкія творы, якія распавядаюць пра пэўныя падзеі мінулага. Такія тэксты немагчыма стварыць без ужывання ўстарэлых слоў, асабліва гістарызмаў. Яны з’яўляюцца важным стылістычным сродкам для стварэння каларыту эпохі, бо надаюць апісанню мінулага рысы гістарычнай дакладнасці.

Выкарыстанне гістарызмаў розных тыпаў і катэгорый у гістарычных творах надае ім рэалістычны нацыянальны каларыт пры адлюстраванні беларускай даўніны. Гістарызмы нячаста становяцца прадметам лінгвістычнага аналізу. Але ў апошнія дзесяцігоддзі адзначаецца павышаная цікавасць да гістарычнага мінулага, з’яўляецца ўсё больш твораў на гістарычную тэматыку. З гэтай прычыны актуальнасць даследавання заключаецца ў вывучэнні гістарызмаў як важных сродкаў стварэння каларыту эпохі ў мастацкіх творах беларускай літаратуры.

Выбар рамана «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» невыпадковы. Найбольш аб'ёмна і дасканала творчыя пошукі беларускіх літаратараў у накірунку спазнання свету адбіліся менавіта ў жанры рамана, галоўныя дасягненні якога прыпадаюць на 60–80-я гг. XX ст. Найбольшых поспехаў у гэтай галіне сярод беларускіх пісьменнікаў дасягнуў У. Караткевіч.

Пры аналізе рамана было высветлена, што ён змяшчае ў сабе вялікую колькасць гістарызмаў розных тэматычных груп. Гэта абумоўлена шырокім колам аспектаў тагачаснага жыцця, якія ў сваім творы апісаў пісьменнік. Ужытыя ў рамане розныя тэматычныя групы гістарызмаў дапаўняюць корпус сродкаў выразнасці сучаснай беларускай літаратурнай мовы, на якія перш за ўсё абапіраўся У. Караткевіч.

Умелае выкарыстанне ім устарэлай лексікі дазваляе ўзнаўляць рэальныя гістарычныя абставіны, трапна характарызаваць вобразы мінулых эпох, надаваць мове пэўныя стылістычныя адценні. Шмат у чым менавіта шырокае выкарыстанне гістарызмаў, не абмежаванае пэўнай семантычнай катэгорыяй, дазволіла аўтару ўмела перадаць атмасферу даўніны. Ужыванне ўстарэлых слоў у рамане працуе на задуму пісьменніка наблізіць да сучаснага чытача асаблівасці жыцця яго продкаў, падрабязна і дакладна апісаць пэўную гістарычную эпоху.

У. Караткевіч, адлюстроўваючы тагачасную рэчаіснасць, імкнуўся засяродзіць увагу на паказе працэсу абуджэння нацыянальнай свядомасці беларускага народа, вызначэнні яго нацыянальнага характару. Таму гістарызмы, як утрымальнікі аўтэнтычнай культуры, сталі ўдалым сродкам пацвярджэння права беларусаў на самавызначэнне.

Акрамя таго, лексіка рамана праз інтэнцыю аўтара часам наўмысна не ўпісваецца ў храналогію падзей, і тады гістарызмы бяруць на сябе ролю стабілізатара часавых рамак паведамлення.

Прааналізаваўшы твор, можна ўпэўніцца ў выключнай ролі гістарызмаў пры стварэнні каларыту эпохі, узнаўленні рэальна-гістарычных абставін і мовы герояў, апісанні сацыяльнага ладу і побыту грамадства. Іх ужыванне неабходна пры напісанні твораў пра мінулае. Раману «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» яны дапамаглі набыць стылістычную завершанасць і цэласнасць. Шмат у чым дзякуючы гэтаму твор у выніку стаў выбітным прадстаўніком свайго жанру, узорным у сваёй катэгорыі.

У рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» найбольш значнае месца адводзіцца гістарызмам грамадска-палітычнага і рэлігійнага парадку; назвам старых мер вагі, даўжыні, грашовых адзінак; назвам зніклых прадметаў побыту, хатняга ўжытку, адзення; назвам культурнага і

навуковага парадку; гістарычным словам ваеннай тэматыкі. У. Караткевіч ахапіў асноўныя бакі жыццядзейнасці беларуса XVI ст. і з дапамагой гістарызмаў у дэталях іх апісаў, пры гэтым не выходзячы за межы патрэбнага гістарычнага антуражу.

Напрыклад, наступныя сказы без гістарызмаў страцілі б сапраўдны каларыт XVI ст. – часу падзей у рамане: «У дзень вялікага суда над мышамі вольны мужык прыгараднай вёскі Занямонне Зянон з'явіўся ў Гародню, каб купіць хаця трэць бязмена збожжа» [1, с. 39] (бязмен – даўняя мера масы на Беларусі, а велічыня ў розныя часы мянялася ад 6 да 10 фунтаў); «Фама заказаў вялікі гляк гарэлкі і закуску» [1, с. 441] (гляк – гліняная пасудзіна для захоўвання і транспарціроўкі вадкіх рэчываў, шарападобная, радзей крыху падоўжаная пасудзіна з плоскім дном, кароткім вузкім горлам з дзюбкай або без яе, 1–2 ручкамі; памеры ад цацачных па 0,1 л да вялікіх 8–10 л).

Сярод іншых гістарызмаў можна адзначыць наступныя: крупнік – старадаўні спіртны напой: спіртны, згатаваны з мёдам, вострымі прыправамі і каранямі; курыя – магістрат, выбарны адміністрацыйны і судовы орган самакіравання ў гарадах, якія мелі магдэбургскае права; мортус – служка пры хворых каранціннымі хваробамі, асабліва чумой; у абавязкі мортуса ўваходзіла і прыбіранне трупаў; пачынак – выселкі, хутар; невялікае паселішча на новым месцы, якое выдзелілася з іншага населенага пункта; паюк – асабісты страж магната, служка, салдат прыдворнай арміі; свайка – народная гульня, якая зводзіцца да кідання вялікага тоўстага цвіка ў колца на зямлі; ярыльшчыкі – воіны, якія павінны даводзіць ворага да раз'юшанасці; сажань – састарэлая адзінка вымярэння даўжыні, упершыню згадваецца ў XI ст.; на тэрыторыі Беларусі выкарыстоўвалася да ўвядзення ў 1918 г. метрычнай сістэмы мер.

Такім чынам, у рамане У. Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» арганічна спалучаюцца глыбокі гісторыка-культурны і гісторыка-сацыяльны аналіз з рамантычным светаўспрыманнем неабыякавага аўтара, які сцвярджае выключны нацыянальны характар свайго народа. Твор на сваім прыкладзе даказвае багатыя творчыя магчымасці беларускай мастацкай прозы. Звяртаючыся ў сваёй творчасці да мінулага, У. Караткевіч імкнуўся не толькі тэматычна, жанрава, стылёва ўзбагаціць нашу літаратуру, але і зрабіць яе беларускай па духу.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Караткевіч У. С.* Хрыстос прызямліўся ў Гародні: Евангелле ад Іуды // Зб. тв.: у 25 т. Т. 9. Мінск : Мастацкая літаратура, 2015. 734 с.